# МУЗЫКІ



адрозніваецца ад усіх зорак беларускіх, расійскіх, замежных, з якімі я працаваў. Яе ззянне ўнікальнае. Найперш — голас, талент. Гэта зразумела, на тое яна і зорка. І, вядома, яе кар'ера ўнікальная. Нямногія спевакі захоўвалі свае прафесійныя якасці на працягу такога перыяду, як творчы шлях Мансерат. Можна меркаваць, што якасці яе характару маглі быць рознымі, у тым ліку і малапрыемнымі, на працягу яе жыцця. Мне ж давялося размаўляць са спявачкай на піку яе трыццацігадовай кар'еры.

У працы са мной разам з высокім прафесіяналізмам яна несла дзіўную мяккасць, дабразычлівасць, гатоўнасць да працы, самаўдасканалення, павагу да аркестра, удзячнасць публіцы і арганізатарам. Перад яе канцэртам у Маскве сабралі журналістаў на прэс-канферэнцыю, я там не прысутнічаў, толькі рэпартаж потым прачытаў. І нехта з языкатых маскоўскіх журналістаў спытаў Мансерат, дзе яна выкапала такога дырыжора, у Маскве не вельмі вядомага — меўся на ўвазе я. Кабалье адказала: «Мне вас шкада, таму што Еўропа яго добра ведае, і я яго добра ведаю як выдатнага дырыжора». Яна была абаяльная і артыстычная пры сваёй нестандартнай паставе. Я атрымаў велізарнае задавальненне — і прафесійнае, і чалавечае — ад зносін з Мансерат Кабалье, вялікай спявачкай, легендарнай дзівай сусветнай оперы.

***— Людзі спаконвек надавалі музыцы, гуку сакральнае значэнне. Даказана, што асаблівыя рытмы могуць увагнаць у транс, вылечыць ці, наадварот, пашкодзіць... Што такое для вас уплыў музыкі найперш — фізіка, псіхалогія ці магія?***

— На гастролях у Токіа я неаднаразова дырыжыраваў цікавымі яркімі класічнымі праграмамі з першакласнымі японскімі аркестрамі. Трох—пяцітысячныя залы з цэнамі 150—200 еўра за білет былі запоўнены да апошняга крэсла. Падчас паклонаў паміж п'есамі я заўважыў у зале людзей, якія спалі. Мяне гэта здзівіла.

Я спытаў менеджараў: як гэта зразумець? Адказ быў просты — гэтыя людзі купляюць нятанныя білеты спецыяльна, каб паспаць пад класічную музыку. Ведаюць, што гэта ім карысна.

Тут, у Мінску, пасля канцэрта шматлікія мае госці прызнаваліся, што збіраліся ў філармонію пасля працы ў цяжкім, стомленым стане, а сыходзілі акрыленыя жыццём. Што да магіі, захоўваю цікавыя ўспаміны.

Неяк я рыхтаваў у Ірландыі вялікую праграму Вагнера. І падчас рэпетыцыі раптам адчуў прысутнасць кампазітара ў зале. Зразумела, я яго не бачыў, але адчуваў вельмі рэальна. Вядома, я быў здаровы і «ў сабе».

Такая вось магія.

***— Як вы думаеце, чаму менавіта Вагнер ушанаваў вас сваёй прысутнасцю?***

— З расійскіх і беларускіх дырыжораў фактычна ёсць толькі двое, я і Гергіеў, хто прадырыжыраваў увесь цыкл знакамітага «Пярсцёнка Нібелунгаў». Я выканаў двойчы: раз — у Ірландыі, другі — у Англіі. Дамогся, каб самыя галоўныя фрагменты сыграць тут, у Мінску, — атрымалася прывезці цэлы чамадан нот, якія тут не дастаць.

***— Здавалася б, як і літаратурная класіка, музычная павінна быць у агульным доступе?***

— Не, не атрымаеш гэта ў агульным доступе — гэта ж партыі для аркестра. А я заўжды стараюся самыя цікавыя свае замежныя праекты пераносіць туды, дзе працую.

***— Мастакі скардзяцца, што сёння малюнкі ствараюць нейрасеткі. Літаратары скардзяцца, што штучны інтэлект піша кнігі, якія цяжка адрозніць ад напісаных чалавекам. Музыку даўно ўжо ствараюць з дапамогай праграм. Ці можа замяніць штучны інтэлект працу дырыжора? Калі не, чаму?***

— Быў у савецкай Расіі музычны калектыў — ПЕРСІМФАНС (Першы сімфанічны ансамбль) — сімфанічны аркестр без дырыжора. Музыкі выдатна спраўляліся з задачай сумеснага музіцыравання. Думаю, што і штучны дырыжор не перашкодзіў бы гэтаму. Калі гэты досвед здзяйсняць у студыі, вы не адчуеце падвоху, ды яшчэ калі на дыску паставіць імя якога-небудзь жывога ці спачылага дырыжора.

Але ёсць іншы аспект. У папярэднім пытанні вы закранулі тэму магіі, бо яна існуе пры зносінах таленавітага дырыжора з аркестрам, і на рэпетыцыі, і асабліва на канцэрце. Ды і публіка гэту магію ловіць. Ніякі штучны інтэлект не будзе валодаць такімі ўласцівасцямі.

***— Ці здаралася, што ўсіх вашых здольнасцяў псіхолага не хапала для працы з нейкім музыкам і давódзілася адмаўляцца ад яго ўдзелу?***

— Цяпер складаная сітуацыя з кадрамі ў аркестрах. Дапускаць вострых сітуацый, на мой погляд, не варта, даводзіцца знаходзіць усе магчымыя шляхі ўзаемаразумення. Лічыцца, і, мабыць, так і ёсць, што існуе дырыжор-дыктатар (дрэнны паліцэйскі) і сябар музыкаў (добры паліцэйскі). Я з тых, хто спалучае гэтыя якасці.

Не дапускаю анархіі і бязладзіцы і люблю добрую творчую атмасферу на працы. Думаю, гэтыя якасці разам з іншымі зрабілі маё знаходжанне на пасадзе галоўнага дырыжора ўнікальным у гісторыі нашага аркестра — 25 гадоў. Гэтым могуць пахваліцца нямногія аркестры. У 84-ы дзень нараджэння Мравінскага адзначалі 50-годдзе яго знаходжання на пасадзе галоўнага дырыжора; маэстра Федасееў у гэтым годзе адзначае канцэртамі за дырыжорскім пультам сваё 90-годдзе і 50 гадоў кіраўніцтва маскоўскім аркестрам імя Чайкоўскага.

***— Вы заўсёды адчуваеце, як уплывае на ігру музыканта яго ўнутраны стан?***

— Так, я адчуваю стан, і эмацыянальны, і фізічны, і цярпліва чакаю вяртання стабільнасці, калі яна парушана. Вось бачу, што музыка раздражнёны, не ў форме — нічога, няхай працуе... Пасля перапынку зменіцца. Музыка сагрэе і вылечыць. Падумайце — опера Вагнера «Нюрнбергскі мейстэрзінгер» ідзе пяць гадзін... Адно першае дзеянне — гадзіна з лішнім... Праўда, спевакі выходзяць на сцэну, у музыкантаў ёсць паўзы... А вось у дырыжора — ні паўз, ні перапынкаў не існуе. І ўсе амаль дзве гадзіны кожнага акта ён павінен быць не проста ў працоўным стане, а пажадана ў натхнёным. І атрымліваецца ж! Калі я дырыжыраваў у Генуі оперу Вердзі — а там спектаклі пачынаюцца ў 20.30, — іду ў тэатр і думаю: як вытрымаць? Опера ў чатырох дзеяннях, скончыцца ў дзве ночы... Пачалася. Першы акт, другі, трэці... І вось ужо чацвёрты пралятае незаўважна — і я разумею, што гэта ж метафара жыцця! Здаецца, столькі наперадзе ўсяго — а жыццё неўзаметку і праходзіць у сваёй музыцы. Дарэчы, схільнасць да філасофскіх разваг — гэта дзякуючы тату. Ён быў дацэнтам кансерваторыі, толькі хоць і цудоўна разбіраўся ў музыцы, але быў філасофам, выкладаў дыялектычны матэрыялізм.

***— Спявачка Галіна Вішнеўская ў сваіх мемуарах апісвае рэальны выпадак, калі прыведзеная ў Вялікі тэатр па прафсаюзнай праграме работніца пляснула дырыжора па плячы і папрасіла не размахваць рукамі і не перашкаджаць музыкантам іграць. Вы часта сутыкаліся з непадрыхтаваным слухачом? Што рабілі ў такіх выпадках?***

— Такіх анекдатычных выпадкаў не было ў маёй практыцы. Дзякуй богу, у філармоніі я маю справу ў працоўны час у офісе, на рэпетыцыях з кампетэнтным менеджментам. Напрыклад, кіраўнік філармоніі генеральны дырэктар Аляксандр Іванавіч Нікіта — музыкант са спецыяльнай музычнай адукацыяй і досведам працы ў сімфанічным аркестры — не выпадковы чалавек у музыцы.

А вось на канцэртах усялякае бывае.

І калі гук сігналу тэлефона падчас музыкі ці апладысменты пасля заканчэння частак у сімфоніі магу зразумець і не тузацца, то выпадак, калі бацькі выпусцілі кантроль над дзіцем і яно стала бегаць па праходзе падчас «Рэквіема» Вердзі, я не мог пакінуць без увагі. Вымушаны быў перапыніць выкананне і папрасіць сям'ю падняцца на балкон, там былі вольныя месцы.

Нашых слухачоў я вельмі люблю, асабліва звычайных, непадрыхтаваных. І былі выпадкі, калі на канцэрце атрымаў ад прыхільнікаў кветкі з уручаў публіцы першага раду партэра ў знак падзякі за тое, што прыйшлі да нас у госці.

***— Калі б вам прапанавалі выбраць адзін твор для таго, каб прадставіць музычную культуру ўсяго чалавецтва для іншай цывілізацыі, што б вы выбралі для выканання і чаму? І якую ўстаноўку далі б музыкам перад гэтым самым важным для чалавецтва канцэртам?***

— Больш складанага пытання ўявіць цяжка. Гэта падобна на «Што б вы ўзялі на бязлюдны востраў», хоць, вядома, яшчэ складаней і глыбей. Такім чынам, жартам адкажу: важна, на якую цывілізацыю нарвешся. Калі падобная на нашу, то можна паспрабаваць узяць прыклад з Растраповіча, які падчас інтэрв'ю на пытанне карэспандэнтаў «Якую музыку вы любіце больш за ўсё» адказваў: «Тую, што зараз іграю».

І на ваша пытанне адкажу аналагічна: цяпер рыхтую да выканання скрыпічны канцэрт беларускага кампазітара Сяргея Бельцюкова, кантату «Карміна Бурана» Карла Орфа, оперу «Замак герцага Сіняя Барада» Бела Бартака. Вось з гэтымі п'есамі я б сёння адправіўся да іншай цывілізацыі. А заўтра?

Пажывём — пачуем.

**Гутарыла Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

---

Мастацтва без межаў

# НАТХНІЦЦА АСОБАЙ І КОСМАСАМ

**У сучасным свеце культура і мастацтва павінны быць асновай міру і супрацоўніцтва паміж народамі. У гэтым перакананы стваральнікі міжнароднага выставачнага праекта «Сто ўсмешак Гагарына: усмешка для Міру». Ён нацэлены дапамагчы шырокай аўдыторыі зразумець, ці магчыма «заслужыць права на подзвіг» і абудзіць у людзях «талент дабрыні». Напярэдадні старту экспазіцыі арганізатары расказалі, што чакае наведвальнікаў і якімі ідэямі прырастае творчая ініцыятыва ў працэсе падрыхтоўкі.**

Выстаўка — вынік супрацоўніцтва Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь і ФДБУК «Аб'яднаны музей-запаведнік Ю. А. Гагарына» (Расія). Яна прымеркавана да 90-годдзя Юрыя Гагарына, запланаванага палёту ў космас першай беларускі Марыны Васілеўскай, а таксама да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі і Дня касманаўтыкі.

— Адкрываем выстаўку «Сто ўсмешак Гагарына: усмешка для Міру» мы 29 лютага. Гэта ўжо трэці наш сумесны праект, створаны разам з мемарыяльным музеем Юрыя Гагарына. І магу сказаць, што супрацоўніцтва, распачатае некалькі гадоў таму, дасць вялікі вынік, таму што ў гэтым праекце нам хочацца не проста паказаць экспанаты, не проста прадставіць новыя творы мастацтва, а стварыць прастору для міратворчага праекта з удзелам Беларусі і Расіі, — адзначыў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь Сяргей КРЫШТАПОВІЧ.** — Мінск ужо шмат гадоў з'яўляецца пляцоўкай для ўрэгулявання палітычных канфліктаў. А мы прыйшлі да меркавання, што варта падключыць да такіх працэсаў культуру, якая з'яўляецца самым магутным фактарам уплыву на свядомасць чалавека, на яго настрой і погляды... Сёння свет рухаецца, на вялікі жаль, не ў тым напрамку, у якім павінен рухацца. Бо чалавецтва з'явілася для таго, каб ствараць, паляпшаць жыццё на планеце. І сваім праектам мы, як некалі зрабіў тое сваёй місіяй Юрый Гагарын, таксама хочам агульнымі намаганнямі даць імпульс міру, надзеі і перамозе над неканструктыўнымі палітычнымі працэсамі.

Выстаўка «Сто ўсмешак Гагарына: усмешка для Міру» аб'ядноўвае ў сабе як экспанаты з музея-запаведніка Юрыя Аляксеевіча Гагарына, так і творчы ўклад у праект міжнароднай супольнасці. Справа ў тым, што ў працэсе работы над будучай экспазіцыяй творчыя ідэі стваральнікаў выстаўкі падтрымала Міністэрства замежных спраў нашай краіны, і ў выніку да яе далучыліся 36 краін, прадстаўнікі якіх скарысталіся магчымасцю творчага самавыяўлення, даслаўшы фотаздымкі і малюнкі па прапанаванай тэме. Адкрыецца выстаўка сінхронна ў Мінску і ў родным горадзе першага касманаўта — Гагарыне. Там з нагоды шэрагу святочных дат запланаваны цікавыя мерапрыемствы.

— Сёлета мы адзначаем 90-годдзе Юрыя Аляксеевіча Гагарына. І ў яго дзень нараджэння 9 сакавіка ў нашым музеі традыцыйна пройдуць 51-я грамадска-навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці першага касманаўта. У рабоце самых розных секцый прымаюць удзел і моладзь, і вучоныя, і канструктары, і касманаўты. Сёлета мы чакаем зноў прыезд вялікай дэлегацыі з Беларусі. Маладыя людзі са Слуцка, Чэрвеня, Смалявіч выступаюць у нас у секцыі «Касманаўтыка і моладзь», — расказвае **куратар міжнародных выставачных праектаў ФДБУК «Аб'яднаны мемарыяльны музей-запаведнік Ю. А. Гагарына» Наталля ГАГАРЫНА.** — Што датычыцца сумеснага праекта «Сто ўсмешак Гагарына...», то ў нашым музеі на пастаяннай аснове дзейнічае аднайменная фотаэкспазіцыя. І менавіта лічбавыя яе копіі мы перадалі Цэнтру сучасных мастацтваў, дапоўніўшы гэта некаторымі прадметамі з нашых фондаў, рэчамі з сямейнага архіва Юрыя Аляксеевіча. Са стартам у Мінску выставачнага праекта «Сто ўсмешак Гагарына: усмешка для Міру» ў нас адкрыюцца выстаўкі «Гагарын — першы назаўсёды» і «Якая прыгожая наша планета» з такой жа тэматыкай. Але хачу сказаць, што асобу Юрыя Гагарына нельга асацыіраваць толькі з яго ўсмешкай. Ён — той чалавек, які ў ходзе доўгага адбору атрымаў права на подзвіг, прычым даводзіў гэта на працягу ўсяго свайго жыцця... Мабыць, у яго быў талент аб'ядноўваць людзей розных краін, розных кантынентаў і нацыянальнасцяў.

Аб ролі міжнароднай супольнасці ў выставачным праекце расказаў **намеснік начальніка галоўнага інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення — начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь Анатоль ГЛАЗ:**

— Для Міністэрства замежных спраў і нашых калег за мяжой, бо асноўная праца легла на іх плечы, вялікі гонар далучыцца да гэтага праекта. Мы абсалютна падзяляем думку, што культура — фактар уплыву. І перакананы, што ўплыў гэты павінен быць пазітыўны. Культура павінна выхоўваць і вучыць дабру, бо дрэннаму ў наш час лёгка навучыцца. Праект «Сто ўсмешак Гагарына: усмешка для Міру» вельмі правільны ў дадзеным кантэксце. Таму што міралюбнасць — у генетыцы беларусаў і людзей постсавецкай прасторы. І яна чырвонай ніткай праходзіць у дзейнасці нашага міністэрства, што не толькі сёння, але і раней скептычна ўспрымалася некаторымі нашымі партнёрамі. Яны спрабавалі наша міралюбства тлумачыць як слабасць. Аднак мы заўсёды будзем прытрымлівацца мірнай, міратворчай палітыкі, бо гэта адпавядае нашаму бачанню свету.

**Алена ДРАПКО.**